Таким образом, категории нравственного порядка воспитываются в человеке только через общение с людьми, через атмосферу доброжелательности в университете, через вовлечение студента в различную творческую деятельность, через акты милосердия, которыми насыщается жизнь студентов в вузе.

Современное образование должно давать не только знания, но и формировать личность, способную жить в ситуации социальной неопределенности, принимать решения и, что немаловажно, нести ответственность за них, вступать в диалог и сотрудничество. По этой причине главная задача вуза – готовить человека к самореализации в основных сферах жизнедеятельности: познавательной, профессиональной, семейной, духовно-культурной, общественно-политической.

**Список литературы**

1. **Березина, В. А.** Воспитание в современном вузе: новые подходы / В. А. Березина // Высшее образование сегодня. – 2002. – № 11. – С. 6−12.

2. **Оствальд, Г. В.** Воспитательные аспекты образовательного процесса / Г. В. Оствальд, С. А. Довбыш, Н. А. Невинская // III Международная научно-практическая конференция «Аграрная наука − сельскому хозяйству». – Барнаул : АГАУ. – 2008. – Кн. № 3. – С. 390–392.

УДК 37.01.3

# АСАБЛІВАСЦІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

*В. М. ХАДАНЁНАК*
*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт*

Імклівыя змены, якія адбываюцца зараз у грамадстве, вымушаюць нас больш уважліва засяродзіцца на праблеме інтэрнацыянальнага выхавання моладзі на сучасным этапе. Сёння разглядаць выхаванне студэнтаў вышэйшай школы толькі як працэс перадачы назапашанага вопыту (ведаў, спосабаў мыслення, маральных, этычных і прававых нормаў) ад людзей сталага веку да моладзі, яўна недастаткова. Рэаліі XXI стагоддзя патрабуюць ад нас больш пільнага ўздзеяння на чалавека з боку грамадскіх інстытутаў і ўстаноў адукацыі з мэтай сфарміраваць у яго пэўныя веды, перакананні і маральныя каштоўнасці. Пры гэтым варта не забывацца на асноўныя прынцыпы сістэмы выхавання: грамадскую скіраванасць, сувязь з рэальным жыццём і працоўнай дзейнасцю, гуманізацыю і асабіста-індывідуальны падыход.

На сённяшні дзень наша краіна імкнецца да развіцця сталага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, навукі і культуры з рознымі рэгіёнамі планеты. Таму праз інтэрнацыянальнае выхаванне мусяць выкрышта-

лізоўвацца гуманныя, роўныя і справядлівыя адносіны паміж людзьмі, незалежна ад іх мовы, колеру скуры, веравызнання, звычаяў і месца пражывання. Тым не менш, кожнай нацыі на розных этапах яе гістарычнага развіцця ўласцівы свае ўласныя культурныя традыцыі і асаблівасці. Яны павінны стаць фундаментам выхаваўчага працэса не толькі для вышэйшай школы, але і для іншых структурных адзінак міністэрства адукацыі.

Інтэрнацыянальнае выхаванне моладзі мусіць базавацца не толькі на маральных каштоўнасцях і аўтарытэтах, але і на эканамічных адметнасцях краіны, яе сацыяльна-палітычнай гісторыі і грамадскіх традыцыях. На жаль, сёння ў жыцці беларускай моладзі можна вылучыць шэраг негатыўных тэндэнцый, якія павінны быць пераадолены, ці хаця бы – мінімізаваны.

Па-першае, у студэнцкім асяроддзі назіраецца імклівая дэгуманізацыя сацыякультурных каштоўнасцей, дэфармацыя пазітыўнага вобраза чалавека і асобы.

Па-другое, у моладзі яскрава дамінуюць спажывецкія арыентацыі над творчымі і камунікатыўнымі.

Па-трэцяе, каштоўнасці айчыннай культуры пастуова выцясняюцца схематызаванымі стэрэатыпамі і стандартамі масавай культуры. Моладзевая свядомасць характарызуецца выразнай адсутнасцю этнакультурнай самаідэнтыфікацыі.

Па-чацвёртае, народная культура (фальклор, традыцыі, звычаі і абрады) часцяком успрымаецца студэнтамі як анахранізм, а замест выдатных беларускіх дзеячаў на першыя ролі выходзяць чужыя нам героі і вынаходнікі. І гэта пры тым, што беларусы маюць сваіх Францішка Скарыну і Казіміра Семяновіча, Еўфрасінню Полацкую і Сігізмунда Юркоўскага, Максіма Багдановіча і Івана Хруцкага.

Па-пятае, імкліва звужаецца сфера выкарыстання беларускай мовы ў студэнцкім асяроддзі. Згодна са звесткамі Нацыянальнага статыстычнага камітэта на 21 лютага 2015 г. на беларускай мове ва ўстановах вышэйшай адукацыі вучацца толькі 0,1 % (300 студэнтаў). Між іншым, мова – гэта генетычная памяць народа, а яе знікненне можа прывесці да скажэння гістарычнай свядомасці народа.

Такім чынам, для паспяховага інтэрнацыянальнага выхавання моладзі на сучасным этапе, неабходна ў выхаваўчым працэсе айчынных вышэйшых навучальных устаноў зрабіць акцэнт на фарміраванне свабоднай, усебакова развітай асобы студэнта. Выпрацоўваць у яго светапогляд, які сцвярджае роўнасць усіх народаў і культур, незалежна ад іх расавай, моўнай, этнічнай і рэлігійнай прыналежнасці. Пры гэтым беларуская культура мусіць стаць тым элементам, які лучыць і яднае народ, мацуе яго самаідэнтыфікацыю і любоў да Радзімы.